А. І. Івахненка

# УКЛАД МАЙГО ПРАДЗЕДА Ў ДАСЯГНЕННЕ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

*У дакладзе прыведзена інфармацыя аб удзеле Пятра Іванавіча Івахненкі, прадзеда аўтара, у ваенных аперацыях у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

У 2026 годзе мы адзначым 81-ю гадавіну Перамогі савецкага народа над нацысцкай Германіяй. Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гг. назаўсёды застанецца ў гісторыі беларускага народа самай крывапралітнай і трагічнай падзеяй. Для народаў Савецкага Саюза, і асабліва для Беларусі, гэта была вайна на выжыванне, вайна за права жыць на сваёй зямлі, вайна за сваю будучыню. Беларусь першай прыняла на сябе сакрушальны ўдар фашысцкага наступу, перажыла доўгія гады жорсткай акупацыі, масавага супраціву сіламі Чырвоай Арміі і партызанскага і падпольнага руху. Яна была вызвалена коштам велізарных намаганняў і мільёнаў жыццяў. Вялікая Перамога, дасягнення якой дабіваліся тысячы вайскоўцаў і ўдзельнікаў антыфашысцкага супраціву, стала ўвасабленнем Подзвігу ўсяго савецкага, у тым ліку беларускага народа, дзякуючы якой людзі змаглі ўбачыць доўгачаканае мірнае неба над зямлёй.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне склалася з мільёнаў асабістых лёсаў, адвагі і рашучасці такіх жа людзей, як і мы з вамі. Кожная сям'я захоўвае сваю памяць аб вайне. Адным з салдат, што ўнеслі вялізны ўклад у супрацьстаянне з нямецкай арміяй стаў мой прадзядуля – Пётр Іванавіч Івахненка. Яго баявы шлях – гэта часціца Подзвігу савецкага народа, і менавіта дзякуючы кожнай такой часціцы мы змаглі адолець фашызм. Памятаць пра яго подзвігі – значыць аддаваць даніну пашаны ўсім, хто падарыў нам мірнае неба [1].

Мой прадзед, Пётр Іванавіч Івахненка, нарадзіўся 12 снежня 1921 г. у вёсцы Перадзелка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці Беларускай ССР. Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён быў прызваны ў рады Чырвогай Арміі Лоеўскім РВК у чэрвені 1941 г. У ходзе абарончых баёў на тэрыторыі Украіны ў 1941 г. трапіў у палон, адкуль потым збег [2].

Пасля вызвалення Лоеўскага раёна Чырвонай Арміяй быў паўторна прызваны 12 снежня 1943 г. сувязістам. Служыў у 158-м гвардзейскім стралковым Полацкім палку 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі 6-й гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту [2].

Пётр Іванавіч удзельнічаў у Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» і вызваленні горада Полацка, прайшоў баявы шлях праз Ленінградскую вобласць, і далей змагаўся з праціўнікам у рэспубліках Прыбалтыкі. Гераічна прымаў удзел у знішчэнні акружанай Курляндскай групоўкі праціўніка. Разам з войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту 51-я гвардзейская стралковая дывізія, у складзе якой і знаходзіўся Пётр Іванавіч, ажыццявіла знакаміты кідок да берагоў Балтыйскага мора, дзе і скончыла Вялікую Айчынную вайну. Камандзірам яго палка быў падпалкоўнік Уладзімір Мікалаевіч Арахоўскі [2].

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Пётр Іванавіч быў узнагароджаны медалём «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», а 6 красавіка1985 г. быў удастоены ордэна Вялікай Айчыннай вайны II ступені, быў узнагароджаны ганаровым знакам «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», а таксама юбілейнымі ўзнагародамі [2].

Пасля заканчэння вайны Пётр Іванавіч вярнуўся на радзіму, дзе прысвяціў сябе мірнай працы. Ён працаваў бухгалтарам у сваёй роднай вёсцы Перадзелка саўгаса «Дняпроўскі». Апошнія гады свайго жыцця Пётр Іванавіч пражыў у горадзе Слуцку Мінскай вобласці, дзе і памёр 21 мая 2010 г. [1].

Мой прадзядуля, як і мноства іншых салдат, унёс свой важкі ўклад у дасягненне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і вызваленне Беларусі ад нямецкафашысцкіх захопнікаў. Я ганаруся ім і многімі іншымі маімі сваякамі, якія мужна і герачна абаранялі Беларусь, тым самым падараваўшы сваім дзецям мірнае неба. Менавіта іх стойкасць перад ворагамі-нацыстамі прынесла нам Вялікую Перамогу. І зараз кожны наш сучаснік павінен памятаць подзвігі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

### *Спіс літаратуры*

1. Материалы семейного архива автора.
2. Память народа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/. – Дата доступа: 22.02.2026.

*Івахненка Арцём Ігаравіч*, студэнт 1 курса ФІТіК БДУІР, artsiom1101@gmail.com
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by